ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 88 (1357) | ПЯТНІЦА, 17-га красавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 60 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.



ПАДХАПІЦЬ БАЯВЫ ЗАКЛІК ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ

Плян ільназагатовак па БССР на 10 красавіка выкананы толькі на 40 проц. Нездавальняючы стан ільназагатовак зрывае пасьпяховае выкананьне прамфінпляну тэкстыльнай прамысловасьці, зрывае ўдарныя тэмпы працы фабрык.

Рабочыя фабрыкі „Дзьвіна" і Аршанскага ільнакомбінату зварочваюцца з адозвай да ўсіх колгасьнікаў, бядняцка-серадняцкага сялянства, раённых партыйных і савецкіх арганізацый з тым, каб яны ўжылі самыя энэргічныя захады і ў мінімальна кароткі тэрмін выканалі на 100 проц. плян ільназагатовак.

У адказ на гарачы заклік трох з паловай тысяч рабочых-ударнікаў тэкстыльнай прамысловасьці, комсамольская арганізацыя абавязана адказаць: плян выкананы!

Адозва рабочых-тэкстыльшчыкаў, іх заклік да бальшавіцкага змаганьня за лён, за ударныя тэмпы загатовак павінна знайсьці гарачы водгук ва ўсіх колгасах і вёсках Беларусі.

Комсамольскім арганізацыям і ячэйкам колгасаў і вёсак трэба шырока абгаварыць гэтую адозву на сходах ячэек, сходах моладзі, беднякоў і серадпякоў. Выкарыстаць гэтую адозву з тым, каб узьняць энтузіязм шырокіх мас колгасьнікаў, беднякоў і серадпякоў на актыўную барацьбу за лён, за пасьпяховае выкананьне задач 3-га, рашаючага году пяцігодкі.

Цесна ўвязаць падрыхтоўку да сяўбы з загатоўкамі лёну, нанесьці руйнуючы ўдар па опортуністычнай практыцы, зламаць кулацкі сабатаж, шырэй разгарнуць соцспаборніцтва і ўдарніцтва паміж бядняцка-серадняцкімі і гаспадаркамі на выкананьне самаабавязацельстваў па ільназагатоўках.

Бліжэйшыя дні павінны даць карэнны пералом. Пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый мобілізаваць усе сілы, навярстаць упушчанае.

Плян ільназагатовак і кантрактацыі павінен быць выкананы.

Комсамол Быхаўшчыны адказвае

У рэдакцыю „Чырвонай Зьмены"

6-IV бюро Быхаўскага РК ЛКСМБ мобілізавала ўвесь комсамольскі актыў гораду на фронт ліквідацыі прарываў у ільназагатоўках, кантрактацыі і падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы.

Бюро райкому катэгорычна патрабавала ад комсамольскіх ячэек ужыць самыя энэргічныя меры і забясьпечыць 100 проц. выкананьне плянаў загатовак валакна, ільнасеньня і кантрактацыі тэхнічных культур. Многія комсамольскія ячэйкі ўжо практычна прыступілі да рэалізацыі пастановы бюро.

Ячэйка саўгасу Гразіноўка і ячэйка школы ШКМ накіравалі брыгады для апрацоўкі лёну у колгас „Комінтэрн". Комсамольскія ячэйкі Быхава мобілізавалі комсамольцаў і накіравалі для апрацоўкі лёну ў колгас імя Сьвярдлова.

Бюро райкому дало заданьне брыгадам праверыць як сельсаветы выконваюць дырэктыву партыі у галіне выяўленьня кулацка-заможных гаспадарак і давядзеньня да іх цьвёрдых заданьняў. Брыгады дапамогуць сельсаветам выявіць поўнасьцю кулацка-заможныя гаспадаркі, давесьці да іх цьвёрдыя заданьні і тэрмінова спагнаць іх.

Разам з гэтым, брыгады ўжо разгарнулі шырокую масавую работу, праводзяць сходы бедпаты і серадняцтва з мэтай мобілізаваць іх ўвагу на пасьпяховае выкананьне ўзятых імі самаабязацельстваў па здачы ільнавалакна.

Сэкратар Быхаўскага РК ЛКСМБ

[подпіс]

„У мінімальна кароткі тэрмін ліквідуем прарыў"

У рэдакцыю газэты „Чырвоная Зьмена"

На запытаньне рэдакцыі: што зрабіла комсамольская арганізацыя для ліквідацыі прарываў ў ільназагатоўках,—Пухавіцкі райком комсамолу адказвае: намі прыняты ўсе захады для ліквідацыі прарываў у выкананьні плянаў ільназагатовак і кантрактацыі.

Мобілізаваны ўвесь раённы актыў і склад бюро райкому і накіраваны ў больш адстаючыя сельсаветы. Організавана 6 ўдарных брыгад для практычнай дапамогі сельсаветам. Брыгады дапамагаюць выявіць поўнасьцю кулацка-заможныя гаспадаркі, давесьці да іх цьвёрдыя заданьні, даабкласьці тых, якія ўжо раней выяўлены і поўнасьцю спагнаць з іх заданьні.

Райком запэўнівае, што тыя рашучыя захады, якія намі ўжыты, дапамогуць ў мінімальна кароткі тэрмін ліквідаваць прарыў.

[подпіс]

Ікен пасьледваць адказ:—ПЛЯН ВЫКАНАН!

Да ўсіх колгасьнікаў, бядняцка-серадняцкага сялянства, раённых партыйных і савецкіх організацый

Ільнапрадзільная фабрыка „Дзьвіна" і Аршанскі ільнакомбінат выконваюць вельмі адказныя заданьні, якія маюць вялікае значэньне для нашай краіны. Аршанскі комбінат выпрацоўвае чосаны лён і ачосы выключна для экспорту, а фабрыка „Дзьвіна" выпускае прадзіва і ніткі, якія ідуць на выраб спэцыяльных тэхнічных тканін і рыбалоўных сетак для здавальненьня патрэб гаспадаркі.

Разгорнуты вытворчы энтузіязм рабочых мас фабрыкі „Дзьвіна" ў будаўніцтве ільнакомбінату, які выліўся ў шырокую хвалю соцспаборніцтва і ўдарніцтва, даў магчымасьць намеціць высокія тэмпы росту продукцыі (у 1931 г. на 34,6 проц. больш, чым у 1930 г.), узьняць продукцыйнасьць працы, зьнізіць сабекошт продукцыі, пусьціць у ход Аршанскі ільнакомбінат.

У той час, калі летась было ахоплена ўдарніцтвам 20,4 проц. рабочых фабрыкі „Дзьвіна", дык у першым квартале г. г. у радох ударнікаў лічыцца 30,1 проц. рабочых. З кожным днём растуць і мацнеюць калёны ўдарнікаў соцыялістычнай прамысловасьці.

Аднак, у выніку нездавальняючых загатовак лёну, усе гэтыя дасягненьні знаходзяцца пад пагрозай. Калі ў бліжэйшы тэрмін ня будуць ужыты самыя рашучыя меры для ўзмацненьня загатовак лёну, прамфінплян абедзьвюх фабрык ня зможа быць выканан з-за недахвату сыравіны.

У дапамогу ільназагатоўкам па раёнах абедзьве фабрыкі паслалі сваіх лепшых рабочых-ударнікаў. Ня гледзячы на гэта, плян загатовак ільнавалакна па БССР выканан на 10 красавіка толькі на 40 проц. замест 100 проц. БССР—на апошнім месцы у Саюзе па здачы лёну.

Мы, 3 з палов. тысячны колектыў рабочых ільняных фабрык „Дзьвіна" і Аршанскага ільнакомбінату сыгналізуем аб пагрозе зрыву адказных заданьняў па выкананьню пляну трэцяга, рашаючага году пяцігодкі.

Мы зварачаемся да вас з гарачым заклікам: забясьпечыце сыравінаю нашы фабрыкі ў гэтым годзе, каб мы маглі выканаць свае баявыя заданьні. Мы заклікаем вас з усёй рашучасьцю, энэргіяй і ўвагай ліквідаваць прарывы ў загатоўках ільнавалакна.

Краіна чакае ад нашых фабрык—экспортных матар'ялаў, тэхнічных тканін і нітак для сетак на рыбную пуціну.

Бліжэйшыя тыдні павінны даць рашучы перелом у загатоўках лёну.

Ад дакладнага выяўленьня непасланага лёну, ад організацыі веснавога расьсьцілу лёну, ад рашучых мер па загатоўках залежыць забясьпечаньне нашых фабрык сыравінай.

Партыя і ўлада надаюць вялікае значэньне разьвіцьцю ільнаводзтва і забясьпечаньню прамысловасьці сыравінай. БССР атрымае ў гэтым годзе сродкі на пабудову 46 ільнаапрацоўчых заводаў, апрача пабудаваных 4-х, коштам у 6 мільёнаў рублёў. Адпускаецца 30 тыс. тон фосфорытнай мукі і 26 тыс. тон раствораў фосфорыту для ўгнаеньня палёў занятых пасевамі лёну. Адпушчаны значныя сумы на кантрактацыю.

Кожны колгасьнік, кожны бядняк і серадняк, кожны вясковы партыец і комсамолец павінны ўсьвядоміць вялікае гаспадарчае значэньне загатовак лёну і стаць барацьбітамі за 100-процантнае выкананьне пляну.

Праводзячы цьвёрдую клясавую лінію ў загатоўках, рашуча націскаючы на кулака, бязьлітасна змагаючыся з опортуністычным патураньнем клясава-варожых элемэнтаў, разгорнем соцспаборніцтва сярод колгасьнікаў, беднякоў і серадпякоў на здачу самаабавязацельстваў па ільну на дапамогу адзін аднаму ў апрацоўцы трасты і расьсьціле саломы, даб'ёмся рашучага зруху ў ільназагатоўках.

Плян веснавой пасеўнай кампаніі гэтага году, другой бальшавіцкай вясны, прадугледжвае значнае пашырэньне плошчы пасеваў лёну і кантрактаваных культур.

Цесна ўвязваючы падрыхтоўку да веснавой сяўбы з загатоўкамі лёну, ударнаючы па опортуністычных разважаньнях аб тым, што веснавая кампанія перашкаджае загатоўкам, скарыстаем другую бальшавіцкую вясну для поўнага выкананьня плянаў загатовак, кантрактацыі і пашырэньня пасеўных плошчаў.

Наш абавязак—вывесьці БССР на першае месца ў Саюзе па ільназагатоўках, забясьпечыць поўнае выкананьне прамфінпляну трэцяга, рашаючага году ільняных фабрык шляхам выкананьня загатоўчых плянаў. Чакаем адказу і конкрэтнай справы.

Сэкратар ячэйкі КП(б)Б фабрыкі „Дзьвіна" Гаворцава.

Ад імя рабочых:
Старшыня фабкому Шафран.
Дырэктар „Дзьвіны" Агееў.
Сэкратар яч. КП(б)Б Аршанскага ільнакомбінату Навумаў.
Старшыня фабкому Зайцава.
Дырэктар комбінату Палякоў.

ДАБ'ЕМСЯ ПЕРАМОГІ

БАРКОВІЧЫ.—Барковіцкі райком ЛКСМБ адказвае на запытаньне рэдакцыі „Ч. З." аб тым, якую работу правяла комсамольская організацыя для ліквідацыі прарываў у ільназагатоўках.

Мы прынялі рашучыя меры супроць тых кіраўнікоў, якія ня здолелі накіраваць энэргію комсамольцаў на выкананьне плянаў загатовак і не праявілі ініцыятыву ў націску на кулацка-заможныя гаспадаркі. Зьняты з работы 2 сэкратары комсамольскіх ячэек і абноўлена кіраўніцтва местачковай ячэйкі ЛКСМБ.

35 кулацкіх гаспадарак за невыкананьне цьвёрдага заданьня аддадзены пад суд. Рад кулацка-заможных гаспадарак за невыкананьне плянаў ільназагатовак, аштрафаваны, спагнана ўжо 7118 рублёў штрафу.

Па зьвестках, з 15 сельсаветах кулацкія гаспадаркі выканалі толькі 70 проц. цьвёрдага заданьня. Раён знаходзіцца ў глыбокім тыле.

Райком накіраваў у дапамогу ячэйкам 9 членаў райкому і 2 члена бюро РК. Дадзена катэгорычная ўстаноўка дабіцца ва што-б там ні стала ліквідацыі прарываў.

5-га красавіка адбыўся раённы сход ЛКСМБ. Організацыя на сходзе абавязалася дабіцца перамогі на фронце загатовак лёну.

Сэкратар Баркавіцкага РК ЛКСМБ

[подпіс]

Кантрактацыя на Дрысеншчыне пад ударам

ДРЫСА.—Тэрміны кантрактацыі яравых канчаюцца. Ільнаводная-ж Дрысеншчына пляну кантрактацыі ў тэрмін ня выканала. Раённая організацыя бальшавіцкімі тэмпамі праводзячы ільназагатоўкі, не ўвязала з гэтым кантрактацыю яравых пасеваў, а галоўнае—лёну, як вядучай культуры ў раёне, не разгарнула політычна-масавай работы сярод колгасьнікаў і аднаасобнікаў каб растлумачыць і популярызаваць гістарычную адозву ЦК і СНК аб кантрактацыі, не вядзе бязьлітаснай барацьбы з кулакамі і опортуністымі. Колгасны сэктар выканаў плян кантрактацыі на 90 проц а аднаасобны, замест 2753 га правёў кантрактацыю 116 га яравых, або 4 проц. плянавага заданьня. Такія культуры, як гарох і бульба зусім не закантрактаваны Райкоопсаюз зусім „забыўся" даць заданьне на бульбу.

У практыцы кантрактацыі рабілася поўная ўступка кулаку. Не да ўсіх кулакоў заможнікаў даведзены цьвёрдыя заданьні на пасеву альбо даводзілася ў вельмі малых размерах. Так у Жоўненскім с-савеце 19 кулацкіх гаспадарак атрымалі заданьне засеяць толькі 22 га. У Бігусоўскім с-савеце 22 кулацкім гаспадаркам дадзена заданьне на 26 га. Такім чынам на 1 кулацкую гаспадарку прыпадае толькі 1,2 га,—акурат столькі-ж і на бядняцка-серадняцкую гаспадарку, згодна пасеўпляну.

Гэтую праваопортуністычную практыку скарысталі кулацкія і класава-варожыя элемэнты для шалёнай агітацыі і зрыву кантрактацыі. У многіх вёсках Цястоўскага Жоўненскага і Сардыцкага с-савету па 5-6 раз праводзіліся сходы, без належнай падрыхтоўчай работы сярод колгасьнікаў і беднаты Кулакі і заможнікі ўсякімі спосабамі зрывалі іх.

Трэба зараж-жа разгарнуць масавую работу сярод аднаасобнікаў па популярызацыі адозвы ЦК і СНК аб кантрактацыі, больш рашуча павесьці бязьлітасную барацьбу з кулацтвам і яго агентурай—правымі опортуністымі, каб да вызначанага пастановай партыі тэрміну выканаць пляны кантрактацыі яравых пасеваў па раёне.

Брыгадзір „ЧЗ"
К—нам.

„Да барацьбы гатоў!“

А. Проко—Ліст з Нямеччыны спэцыяльна „Чырвонай Зьмены“

Комсамол Нямеччыны праводзіць да 15 мая свой квартальны „штурмавы плян“.

Агульнанямецкі дзень моладзі завяршыў першы этап „штурмавога пляну“ і даў магчымасьць падвесьці некаторыя вынікі „баявой гатоўнасьці і дысцыплінаванасьці нямецкага комсамолу.

Агульнанямецкі дзень моладзі быў экзаменам. Фашысцкі ўрад Брунінга рыхтаваў і рыхтуе, тым больш цяпер удары для рэволюцыйнай працоўнай моладзі Нямеччыны. Комсамол даў адпаведны адказ на ўзмоцненае наступленьне рэакцыі. Дзякуючы гэтаму, фашысцкі ўрад ня здолеў выцясьніць комсамол з яго позыцый, ізоляваць яго ад мас працоўнай моладзі.

Сёньня кожны працоўны Нямеччыны разумее важны факт: ня гледзячы на забарону, ня гледзячы на тэрор і масавыя арышты, ня гледзячы на фактычны ваенны стан, які ўвёў урад Брунінга.

Комсамол Нямеччыны па ўсёй краіне дэмонстраваў у час агульнанямецкага дня моладзі і паказаў сваю баявую гатоўнасьць!

У Бэрліне адбылося 15 дэмонстрацый —арыштавана 224 чалавекі.

У Браўншвэйгу—сотні „лятучых сходаў“—437 арыштаваных.

У Франкфурце—18000 на сходах комсамолу—48 арыштаваных.

Ва Усходняй Прусіі—дэмонстрацыі ў Інстэрбургу, Эльбінгу і ў іншых мясцох—80 арыштаваных.

У Саксоніі—22 дэмонстрацыі. Маса арыштаваных.

У Турынгіі—забароненыя дэмонстрацыі у Іене, Эрфурце, Эйзэнасе, Гоцы, —ня гледзячы на тэрор паліцыі, толькі 3 (!) арыштаваных.

У Гамбургу—дзесяткі забароненых дэмонстрацый, але кожны раз паліцыя прыходзіла „занадта позна“,—таму толькі 4 арыштаваных.

Гэты сьпіс можна працягваць і далей. Няма такога месца ў Нямеччыне, дзе не адбыўся-б агульнанямецкі дзень моладзі, дзе не адбыўся-б энтузіязм і энэргія комсамолу.

А ў Бэрліне засядаў нелегальна „Кангрэс рэволюцыйнага адзінства!“

Праўда, ён ня мог прыняць такія формы, як раней меркавалася, калі ішла падрыхтоўка да легальнага конгрэсу. Але гэтая забарона не магла адбіцца на масавым уплыве конгрэсу.

К легальнаму конгрэсу было абрана 2000 дэлегатаў з усёй Нямеччыны, сярод іх 400 пролетарыяў, членаў с.-д. саюзу моладзі, абураных палітыкай соцыял-фашысцкіх лідэраў, шмат прадстаўнікоў рэволюцыйных членаў хрысьціянскіх і нацыяналістычных саюзаў моладзі. Вось гэтага грандыёзнага конгрэсу і спужалася соцыял-фашысцкая і фашысцкая зграя, яны спужаліся адзінага фронту падрастаючага пакаленьня працоўных Нямеччыны. А тэрорам яны могуць ставіць часовыя перашкоды, могуць ізоляваць тых ці іншых барацьбітоў,—але ня могуць затрымаць разьвіцьця рэволюцыйнага адзінага фронту працоўнае моладзі, ня могуць ізоляваць організацыю рэв. моладзі—Комсамол!

Вось гэта якраз і паказаў конгрэс. Больш 300 дэлегатаў, прадстаўнікоў фабрычнай моладзі, беспрацоўнай і галадаючай моладзі, вясковай моладзі і профшкол, з вялікай цяжкасьцю сабраліся ў Бэрліне. Сярод іх прадстаўнікі с.-д. і хрысьціянскай моладзі—асабліва важны момант для характарыстыкі конгрэсу. Бо гэты конгрэс быў „конгрэсам рэволюцыйнага адзінства“!

Да гэтага конгрэсу адбываліся абласныя конгрэсы, на якіх было абрана звыш 2800 дэлегатаў для агульнанямецкага конгрэсу. На гэтых конгрэсах шматлікія прадстаўнікі здрадніцкіх організацый моладзі парывалі са сваімі організацыямі і прыходзілі ў Комсамол.

Орган опозыцыйных членаў с.-д. саюзу моладзі, „Весьнік опозыцыі Соц.Саюзу Моладзі“ характарызуе гэтыя выступленьні наступным чынам:

„Мы ня толькі члены ССМ, але ў першую чаргу сьвядомыя маладыя рабочыя, соцыялістыя, якія будуць змагацца супроць Брунінга і Грэнэра (ваенны міністар А. П.) і іх перамогуць! І калі нас упікаюць у тым, што мы атрымоўваем указаньні з Масквы, дык мы адказваем Вэльсу (лідэр соцыял-фашыстых), Оленгаўэру (бюрократ з ССМ) Шэпфліну (с.-д. дэпутат рэйхстагу, які сказаў, што ён лепш дзесяць раз пойдзе з Грэнарам, чым адзін раз з комуністымі!).

„Мы ідзем лепш дзесяць раз і заўсёды з комсамольцамі, з нашымі савецкімі братамі па рэволюцыйным шляху, чым адзін раз, чым нават адзін крок з вамі па шляху здрадніцтва справе пролетарыяту!“

Падобныя прамовы, падобны баявы энтузіязм гучэў і на „конгрэсе рэволюцыйнага адзінства“.

Чым адрозьніваецца цяперашні 6-ты агульнанямецкі дзень моладзі, ад леташняга пятага дня моладзі ў Лейпцыгу?

6-ты дзень моладзі куды хутчэй і мацней укараніўся ў масах працоўнай моладзі, чым пяты. І хаця дэлегацыі

Перадача сьцягу Бэрлінскаму комсамолу ад КПГ за добрую вярбоўку рабочай моладзі ў КСМ.

фабрычнай моладзі прыходзілі на „конгрэс рэв.адзінства“, не з траспарантамі, як у мінулым годзе, але затое яны маглі гаварыць ад імя больш шырокіх мас моладзі і абгаварваць меры практычнай барацьбы. У мінулым годзе комсамол зрабіў першую прабоіну ў с.-д. і хрысьціянскіх організацыях моладзі. Лейпцыг даў штуршок к далейшаму падрыву варожых організацый. Жаданьне адзінства ў барацьбе загарэлася. А сёлета няма ніводнай с.-д. організацыі моладзі без опозыцыянэраў, і комсамолу прадстаіць задача

ліквідацыі с.-д. саюзу моладзі!

На абласных конгрэсах да комсамолу перайшлі 254 членаў с.-д. моладзі і 91 член „Гітлер'югенд“ (фашысцкая організацыя моладзі).

Гэты апошні год з яго шматлікімі масавымі забастоўкамі, у якіх моладзь прымала самы актыўны ўдзел, загартаваў маладых нямецкіх ленінцаў. Нельга цяпер уявіць сабе масавую барацьбу супроць фашызму, масавыя стачкі без комсамолу і організацый, якія блізка стаяць да яго.

Комсамол—самая моцная пролетарская організацыя моладзі ў Нямеччыне. Мэта:—50.000 членаў комсамолу ка дню моладзі

выканана!

Пачаўся другі этап „штурмавога кварталу“. Комсамол мобілізаваны цяпер да падрыхтоўкі 1 мая. Яго не спалохае тэрор фашысцкіх банд і соцыялфашысцкіх поліцэйпрэзыдэнтаў. За апошні год дзесяткі комсамольцаў забіты і сотні паранены соцыял-фашысцкай поліцыяй і фашысцкімі бандамі. Звыш 1000 комсамольцаў арыштаваны толькі ў сувязі з днём моладзі.

Але комсамол не адступіць!

„Маладая Гвардыя“—баявы орган комсамолу Нямеччыны, заяўляе:

„Мы ведаем па якім шляху нам ісьці, нам вядома наша мэта. Цяпер ідэі соцыялізму яшчэ мацнейшыя, чым у рэв. руху ў часе вайны і ў 1917 годзе. Савецкі Саюз вучыць нас, што:

1) пануючая кляса сёньнешняга дня і яе сыстэма развальваюцца і будуць разбураны пролетарскай рэволюцыяй.

2) мы—пануючая кляса заўтрашняга дня.

Мы будзем пераможцамі! Сьмеласьць, і яшчэ раз сьмеласьць!

Комсамол Нямеччыны адказвае баявым лёзунгам „Антыфашысцкай Маладой Гвардыі“:

Да барацьбы гатоў!

А. Проко.

Лейпцыг 11-га красавіка 1931 г.

Гішпанская монархія рухнула

ЛЁНДАН, 16.—Як паведамляюць з Гішпаніі, часовы ўрад апублікаваў паведамленьне, у якім заявіў, што ён на ставіць сваёй задачай выпрацоўку рэспубліканскай конституцыі, бо гэта задача ўстаноўчага сходу. Часовы ўрад здае справаздачу ў сваіх дзеяньнях перад устаноўчым сходам. Урад гарантуе, што права ўласнай маёмасьці ня будзе парушана і абяцае палепшыць становішча сялянства.

* * *

БЭРЛІН, 15.—Як паведамляе „Вэльт ам абэнд“, у Мадрыдзе і ў іншых буйных гарадох Гішпаніі абвешчана ўсеагульная забастоўка. Атрыманы паведамленьні аб вулічных сутычках. Забастоўка ахапіла амаль усе промысловыя раёны Гішпаніі. Пад кіраўніцтвам рэволюцыйных профорганізацый на прадпрыемствах ствараюцца забастовачныя камітэты. Урад і соцыялісты заклікаюць рабочых вярнуцца на заводы. Газэта лічыць, што маркоўчы паводзе сваю новых міністраў, амністыя ня будзе распаўсюджана на лідэраў рэволюцыйнага рабочага руху, якія знаходзяцца ў турмах.

У сваёй дэкларацыі, як паведамляе „Вэльт ам абэнд“, рэспубліканскі ўрад заявіў, што ён захоўвае за сабою права абмяжоўваць і нават зусім зьнішчыць усе дэмократычныя вольнасьці.

* * *

БЭРЛІН, 15.—„Вэльт ам абэнд“ піша, што сапраўднай прычына такога хуткага падзеньня монархіі ў Гішпаніі— выступленьне гішпанскага пролетарыяту.

Соцыялістычная партыя зьвярнулася да рабочых з адозвай, у якой заклікае іх „захоўваць парадак“.

* * *

ПАРЫЖ, 15.—„Матэн“ зьмяшчае тэлеграфную корэспондэнцыю Заўэрвэйна з Мадрыду, які піша: „бясспрэчна, што ў Барсэлёне яшчэ ў большай колькасьці, чым у Мадрыдзе, ёсьць небясьпечныя элемэнты, якія імкнуцца не да буржуазнай рэспублікі, а да соцыяльнай рэволюцыі“. Ва ўсякім выпадку ні Францыя, ні Англія,—працягвае Заўэрвэйн,—ня могуць роўнадушна глядзець на ператвараньне тэрыторыі да Гібралтара ў адзін суцэльны ачаг бальшавізму“. Заўэрвэйн лічыць „добрым прадвызначэньнем“ заяву генэрала Сан-Хурхо (асабісты сябра былога дыктатара Прымо-дэ-Рыверы), што яго выпрабаваныя 50.000 салдат атрымалі загад аддаць сябе ў распараджэньне новага ўраду для падтрыманьня парадку.

„Віктуара“ піша: „Услед за першай хваляй, якая ідзе са сьпевам „Марсэльезы“ і вітае волю, ідзе другая, больш грозная хваля, са сьпевам інтэрнацыяналу і з патрабаваньнем ня толькі брацтва народаў, але і ліквідацыі прыватнай уласнасьці і індывідуальнай свабоды і ўстаноўленьня пролетарскай дыктатуры. Заканчвае свой артыкул Эрвэ наступнымі словамі: „Ад Мадрыда да Масквы ня так далёка, як гэта думаюць“.

Утварэньне новай улады

ПАРЫЖ. Паводле даных агенцтва Гавас выяўляецца наступны першапачатковы малюнак утварэньня новай улады. Пасьля свайго адрачэньня, Альфонс XIII перадаў уладу прэм'еру Азнару. Азнар зараз-жа перадаў уладу Раманонэсу (міністар замежных спраў ва ўрадзе Азнара). Раманонэс, у сваю чаргу, зараз-жа перадаў уладу старшыні часовага ўраду Замора.

Зараз-жа пасьля свайго адрачэньня, Альфонс XIII пачаў рыхтавацца да паспешнага выезду з Гішпаніі. Часовы ўрад прадаставіў яму магчымасьць выехаць, гарантаваўшы яму і яго сям'і поўную бясьпечнасьць. Вечарам 14 Альфонс XIII, па чутках, выехаў у Картахэну (Гішпанскі порт каля Міжземнага мора). Адначасова распаўсюдзіліся чуткі, што кароль зьбег у кірунку францускай граніцы. Супярэчлівыя чуткі паказваюць, што ўрад адмаўляецца ўказаць месца, куды выехаў кароль. Існуе ўражаньне, што ўрад скрывае сваё адказнасьць за ўцёкі караля. Замора дае зразумець, што кароль пад сваім ад'ездам падпісаў маніфэст, як кароль пакіне межы Гішпаніі.

Баявога размаху яшчэ няма

6-цімесячнік ліквідацыі політняпісьменнасьці разгортваецца дрэнна

Па-ўдарнаму ўключыцца ў паход за аўладаньне кожным комсамольцам політмінімуму

На старонках „Ч. З.“ была зьмешчана пастанова ЦК УсеЛКСМ аб ажыцьцяўленьні рашэньняў ІХ-га зьезду комсамолу па ліквідацыі ў 6-ці месячны тэрмін політняпісьменнасьці вясковага комсамолу.

Любаньскі РК ЛКСМБ па-ударнаму ўзяўся за ліквідацыю маючыхся ў гэтай галіне прарываў; ён абвясьціў эстафэту—паход за ліквідацыю політняпісьменнасьці.

Але па шэрагу раённых організацый комсамолу, у гэтай галіне зруху яшчэ не наглядаецца. Так ў Асьвеі і Старобіне ў выніку невыстарчальнай увагі і адсутнічаньня сыстэматычнага кіраўніцтва з боку РК політвучоба сарвана.

У пастанове ЦК УсеЛКСМ былі вызначаны практычныя задачы гарадзкіх організацый у галіне дапамогі комсамолу вёсак па ліквідацыі яе політняпісьменнасьці. У прыватнасьці 15-IV—31 г. павінен быў распачацца двухтыднёвік збору сродкаў і літаратуры для вёскі, мобілізацыя прапагандыстых у лік тысячы, пасылка прапагандысцкіх брыгад і г. д.

Аднак трэба адзначыць, што гарадзкія організацыі яшчэ нічога не зрабілі па выкананьню гэтых задач.

Трэба рашуча ўдарыць па тых, якія ня выконваюць пастаноў зьездаў. Гэты месяц павінен стаць пераломным у становішчы політвучобы. Вопыт перадавых раёнаў узяўшыхся па-ўдарнаму за ліквідацыю політняпісьменнасьці вясковага комсамолу павінен быць перанесены ва ўсе астатнія раёны Беларусі.

30 проц. комсамольцаў наведваюць політгурткі

На заводзе „Труды“, Полацкага раёну, да гэтага часу шырока разгорнута распрацоўка пастаноў комсамольскіх зьездаў. На занятках гурткоў, якія існуюць пры некаторых ячэйках, зьяўляецца ня больш 30 проц. усіх комсамольцаў. На заняткі часьцяком ня прыходзяць і сэкратары ячэек. Беспартыйная моладзь заводу ў гурткі ня ўцягнута. Бюро колектыву не рэагуе на зрыў заняткаў па вывучэньню рашэньняў зьездаў.

Кветка.

Любаньская комсамолія ўключылася ў паход

З 30-га красавіка Любаньскай комсамольскай організацыяй, у мэтах ажыцьцяўленьня пастаноў зьездаў комсамолу аб ліквідацыі політ-няпісьменнасьці вясковага комсамолу, праводзіць эстафэту—паход за рэволюцыйную тэорыю.

Эстафэта—паход падзяляецца на 2 этапы. Першы этап эстафэты ўключае ў сябе два маршруты.

Задачы 1-га маршруту: а) ахапіць комсамольцаў на 100 проц. розрымі відамі політвучобы, б) распаўсюдзіць 6-томнік Леніна сярод комсамольскага актыву і дакладна вывучыць ленінскую тэорыю, в) глыбока прапрацаваць рашэньні апошніх зьездаў комсамолу.

Каб ажыцьцявіць гэтыя задачы, райком комсамолу намеціў наступныя мерапрыемствы:

1. З 1-га сакавіка г. г. правесьці раённую мэтодычную конфэрэнцыю кіраўнікоў політгурткоў з мэтай растлумачэньня задач паходу і форм політвыхаваньня.

2. З 1-га па 3-е красавіка па ячэйках правесьці ўдарны трохдзёньнік праверкі становішча політвучобы, вынікі якога абгаварыць на агульных сходах ячэйкі. Таксама вызначыць далейшыя мерапрыемствы па палепшаньню становішча політвучобы, па ахопу ўсіх комсамольцаў і беспартыйнай батрацка-бядняцка-серадняцкай і колгаснай моладзі політ-выхаваўчай работай.

3. Правядзеньне гутарак сярод комсамольцаў і беспартыйнай моладзі аб пастановах 9-га і 10-га зьездаў комсамолу.

Другі маршрут ставіць сваёй мэтай: організаваць масавую праверку ўдзелу ячэйкі ЛКСМБ у колгасным будаўніцтве падрыхтаванасьці колгасаў да выезду ў поле.

Маршруты другога этапу эстафэты паходу ставяць перад сабой мэту практычна падрыхтавацца да летняй політвучобы і працы на полі ў час вясеньняй сяўбы.

Праваопортуністычная практыка ў выкананьні пастаноў зьездаў

Бюро ЦК ЛКСМБ па дакладах Старобінскага і Асьвейскага РК ЛКСМБ у сваёй пастанове запісала „ход і тэмп політвучобы па гэтых організацыях нездавальняючыя і ні ў якай ступені не забясьпечваюць выкананьне рашэньняў апошніх зьездаў комсамолу і пастановы ЦК КП(б)Б аб політвучобе ў комсамоле“. Асьвейскі РК у сваёй практычнай дзейнасьці праявіў праваопортуністычную недаацэнку значэньня аўладаньня рэволюцыйнай тэорыяй, што прывяло да поўнага зрыву політвучобы па раёну, да праваопортуністычнай практыкі ў асобных ячэйках. За зрыў політвучобы па організацыі, за праваопортуністычную практыку бюро ЦК ЛКСМБ абвясьціла сэкратару Асьвейскай комсамольскай організацыі вымову.

Запамяталі аб каштоўным рашэньні

Комсамольскі колектыў дрэваапрацоўчага комбінату г. Бабруйску па-ўдарнаму ўзяўся за вывучэньне рашэньняў комсамольскіх зьездаў. Па ўсіх ячэйках працуюць гурткі.

У ФЗВ акрамя політгуртка організаваны і працуе гурток марксызму і ленінізму, які ахапляе ўвесь актыў ФЗВ.

На бюро колектыву ЛКСМБ комбінату было вырашана ахапіць гэтым гуртком увесь комсамольскі актыў комбінату, але пра гэтае рашэньне бюро комсамольскага колектыву запамятала і не правяла ў жыцьцё.

ПЕРАЛЬМАН.

Будаўнікі раўняйся па бакінцам!

Будаўнічы сэзон гэтага году зьяўляецца рашаючым сэзонам Сёлетняе будаўніцтва павінна забясьпечыць выкананьне пляну 3-га, рашаючага году пяцігодкі, будаўніцтва новых 518 фабрык і заводаў павінна ў значнай меры паслужыць узмацненьню абароназдольнасьці нашай краіны.

Але тэмп падрыхтоўкі і разгортваньня будаўніцтва зусім нездавальняючы. Бясплянавасьць у разьмеркаваньні і забясьпячэньні матар'ялямі, непадрыхтаванасьці об'ектаў, опортуністычная стаўка на самацёк у галіне вярбоўкі рабочай сілы,—усё гэта, разам узятае, увачавідку пагражае пасьпяховаму правядзеньню будаўнічага сэзону.

Мы адзначаем яўна опортуністычныя адносіны будаўнічых організацый да стандартызацыі будаўніцтва. Гэты вучастак усё яшчэ адсталы і яго неабходна падцягнуць.

Падрыхтоўка кадраў і лесаматар'ялаў праводзіцца бясчынна, аб гэтым сьведчыць становішча „Будвучу" Белдзяржбуду, слабае разгортваньне лесасплаву.

Неабходна прыняць рашучыя захады і забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў будаўніцтва 3-га, рашаючага году пяцігодкі. Ня гледзечы на ўсе цяжкасьці, раўняючыся па бакінцам, дамагацца поўнага выкананьня намечаных бальшавіцкіх плянаў.

За вамі слова, таварышы

Адкрыты ліст ячэйкі ЛКСМБ абутковай фабрыкі ячэйцы Цэнтральных майстэрняў

Пабудова Менскай абутковай фабрыкі—гэта першая на Беларусі комсамольская малавзёжная пабудова па ініцыятыве комсамольскай організацыі Белдзяржбуду.

Пастановай партколектыву пабудова павінна быць скончана да 1-га мая 1931 году. Комсамольская ячэйка пабудовы абутковай фабрыкі падхапіўшы ініцыятыву „Чырвонай Зьмены», уключылася ў вытворчыя манэўры і паставіла перад сабою мэту: скончыць пабудову да 25 красавіка 1931 году,

Усе сілы палажаны на выкананьне пляну. Усе магчымасьці пабудовы мобілізаваны на выкананьне гэтага пляну. Мы зварочваемся праз газэту „Чырвоная Зьмена" да ячэйкі Цэнтральных майстэрняў.

Вы у самы кароткі тэрмін павінны забясьпечыць нашу пабудову ваконнымі пераплётамі і дзьвярыма бо ад ўдзелу вашай ячэйкі залежыць пасьпяховае выкананьне пляну. Шляхам разгортваньня вытворчых манэўраў, мобілізацыі ўсіх сіл і магчымасьцяй мы павінны забясьпечыць бесьперабойную працу, каб у тэрмін скончыць пабудову.

Мы просім даць адказ на наш выклік, забясьпечыўшы выкананьне нашых плянаў.

Бюро комсамольскай ячэйкі

ЛЕС ДАМО БУДАЎНІЦТВУ!

Лесасплаў 1931 году павінен забясьпечыць выкананьне плянаў 3-га, рашаючага

(З пастановы бюро ЦК ЛКСМБ)

Заданьне Лесбелу па лесасплаву 1931 г., у параўнаньні з мінулым годам, павялічана на 75,3 проц.

Выкананьне гэтай вялікай програмы сустрэне на сваім шляху рад цяжкасьцяй, на перамогу якіх патрэбуецца мобілізацыя самых шырокіх мас рабочых і працоўных вёскі.

Комсамольская організацыя павінна адыграць вялікую ролю, мобілізаваўшы ўвагу ўсей рабочай і працоўнай моладзі на пасьпяховае выкананьне лесасплаўнай кампаніі.

Гаркомы і райкомы, дзе праводзіцца падрыхтоўка да сплаву і выплаву да цэнтральных басэйнаў да гэтага часу не забясьпечылі неабходнага ўдзелу ў гэтай рабоце комсамольскай організацыі.


Выходзячы з гэтага бюро ЦК пастанаўляе:

1) Прапанаваць РК і ячэйкам тэрмінова разгарнуць падрыхтоўчую і растлумачальную працу сярод комсамольцаў бедняцка-серадняцкай колгаснай моладзі і працоўнага насельніцтва ў падрыхтоўцы да адчыненьня навігацыі, распрацаваўшы конкрэтныя мерапрыемствы для поўнага выкананьня кантрольных лічбаў 3-га году пяцігодкі.

2) Улічваючы неабходнасьць узмацніць палітвыхаваўчую работу сярод сплаўных рабочых і забясьпечыць іх партыйна-комсамольскай праслойкай, мобілізаваць 500 комсамольцаў, якія павінны падаваць прыклад і забясьпечыць ударныя тэмпы ў выкананьні лесасплаўнай програмы, разгортваньні соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

3) Лічыць неабходным на буйных лесасплаўных пунктах організаваць комсамольскія ячэйкі, даручыўшы орг інструктарскаму аддзелу распрацаваць структуру работы гэтых ячэек.

4) Прапанаваць РК і ячэйкам праверыць гатоўнасьць мясцовых сплавачных організацый і кооперацыйных органаў да забясьпячэньня і абслугоўваньня сплаўшчыкаў харчамі, спэцвопраткай і інш. Абавязаць Менскі гарком КСМ організаваць налёт РК „лёгкай кавалерыі" на Белкоопсаюз і Лесбел з мэтай праверыць, як выконваюцца дырэктывы партыі ў галіне забесьпячэньня спэцвопраткай і прамтаварамі.



На поўны ход лесазаводы

За соцыялістычную стандартызацыю будаўніцтва

Стандартызацыі належыць вядучая роля ў рацыяналізацыі мэтодаў будаўніцтва.

Наметкі 5-цігадовага пляну прадугледжваюць—у выніку стандартызацыі бэтоннага, жалеза-бэтоннага і драўлянага будаўніцтва—мажлівасьць экономіі ў разьмеры 5 мард. рублёў.

Распрацоўваемыя конструкцыі драўляных зборных дамоў, якія выпрацоўваюцца па шчытавой сыстэме, скарачаюць у параўнаньні са звычайным драўляным будаўніцтвам выдатак драўніны да 20 процантаў. Ужываньне гэтых стандартных конструкцый—пры аб'ёме будаўніцтва ў 40 млн. кбм.—дасьць экономію сродкаў у разьмеры 6 млн. руб. на кожны мільён кубічных мэтраў, што складзе па ўсей програме 240 млн. руб.

Адна гэта экономія з лішкам пакрывае выдаткі па пабудове дрэваапрацоўчых заводаў, неабходных для разьвіцьця будаўніцтва стандартных жыльлёвых памяшканьняў.

Аб экономічным значэньні гэтых стандартаў можна судзіць хаця-б па таму, што адны толькі штандарты на вокны і дзьверы дадуць магчымасьць з'экономіць у 1931 г. 15 млн. руб. Выдатак матар'ялаў пры выбару стандартных вокан і дзьвярэй,—што таксама надзвычайна вельмі важна—можа быць зьніжаны на 25 проц.

У галіне будаўнічых матар'ялаў вялікае значэньне будзе мець таксама распрацоўваемыя і часткай ужо распрацаваныя Інстытутам норм і стандартаў ясныя штандарты на новыя віды сьценавых матар'ялаў (порыстая і трэпельная цэгла, трэпельная гліна, шлякавая цэгла і інш.), стандарты ізоляцыйных матар'ялаў, вяжучых раствораў мясцовых матар'ялаў (туф, ракушэчнік і інш.), а таксама стандарты на рад новых матар'ялаў.

Вялікае значэньня для будаўніцтва будуць мець стандарты на рубероід і картон для рубероіда і на сланцовыя пліткі для дахаў. Гэтыя матар'ялы дадуць магчымасьць асвабадзіць для патрэб прамысловасьці тысячы тон жалеза.

У галіне нормаваньня работ будаўніцтва атрымала ў гэтым годзе „адзіныя нормы выпрацоўкі па будаўнічай вытворчасьці" на ўсе віды асноўных будаўнічых работ. Гэтыя нормы ў параўнаньні з мінулым сводам вытворчых норм, даюць у сярэдзім 15—20 проц. эканоміі пры вызначэньні неабходных затрат рабочай сілы.

Гэтыя нормы могуць і павінны стаць выходным момантам для далейшага павялічэньня вытворчасьці працы на аснове соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Усякія-ж спробы ў той ці іншай форме затрымаць тэмп і размах работы па стандартызацыі будаўніцтва ў нашых умовах ня могуць быць ацэнены інакш, як праявы опортунізму на практыцы.

М. В.

Улічыць памылкі!

Ня гледзячы на своечасовыя сыгналы друку аб наяўнай пагрозе зрыву будаўнічага сэзону, падрыхтоўка ідзе надзвычайна марудна. Пабудовы не забясьпечаны будаўнічымі матар'яламі, у гэтым сэзоне паўтараюцца мінулыя памылкі—бесплянавае разьмеркаваньне матар'ялаў і інш.

Работаваўцы ўвесь час абяцаюць прадставіць матар'ял, але абяцаньні ня выконваюцца. Ёсьць пагроза, што калі гэтымі днямі ня прыбудзе матар'ял на ф-ку-кухню цесьлярам і арматуршчыкам ня будзе чаго рабіць. На пабудове растаўлены розныя мэханізмы, але ня ўсе яны выкарыстоўваюцца.

На пабудове ф-кі-кухні ўжо амаль год стаіць замежная машына для выгнуцьця арматуры і гэта машына не выкарыстоўваецца, ржавее і псуецца.

Мясцовыя матар'ялы, як гравій, пясок і цэгла загатоўлены на 50 проц., надзвычайна мала ваганетак. Будаўніцтву патрэбна будзе больш 2 тысяч рабочых, але іх яшчэ не пачалі вербаваць.

Праходзячыя па ініцыятыве „Чырвонай Зьмены" на пабудовах вытворчыя манэўры, дадуць значны зрух у падрыхтоўцы да сэзону. Дзякуючы ўпартай працы комсамольцаў на пабудове дому ДПУ, прарывы з забясьпечаньнем матар'ялу значна ліквідаваны.

З боку гаспадарчых організацый адчуваецца пэўнае безадказнасьць, безгаспадарчыя адносіны да сэзону.

Становішча з падрыхтоўкай сьведчыць аб тым, што мінулыя ўрокі ня ўлічаны. Як мага хутчэй іх неабходна ўлічыць.

Сама Крытыкоўскі.

„72 тысячы?... Мала"

Чаму зрываецца будаўніцтва тэхнікуму

Яўрэйскі сельска-гаспадарчы тэхнікум рыхтуе спэцыялістых для буйных соцыялістычных гароднамалочных гаспадарак,

У тэхнікуме навучаецца 170 студэнтаў, а ўжо ў кастрычніку 1931 году павінна быць 270-280 чал.

Камісія па агляду ўстанавіла, што становішча тэхнікуму надзвычайна цяжкое ў сувязі з недахопам жыльлёвай плошчы, якое хапае толькі на 100 асоб.

Наркомзем вызначыў на будаўніцтва тэхнікуму 72 тыс. рублёў і гарантуе забясьпечыць яго асноўнымі будаўнічымі матар'ялямі.

Больш двух месяцаў дырэкцыя тэхнікуму дабіваецца скласьці ўмову з будаўнічымі організацыямі Менску. Зварочваліся за дапамогай у Гарсавет. Дзяржплян і рад іншых установ, але да гэтага часу ніякіх вынікаў няма.

Усе будаўнічыя організацыі, выходзячы з ведамственых інтарэсаў катэгорычна адмаўляюцца ўзяць на сябе будаўнітва. Асноўны іх мотыў, што будаўніцтва на 72 тыс. руб. для іх невыгадная справа.

Час праходзіць. Ужо зараз ёсьць пагроза што занятті, спыняцца. Набор увосень таксама можа быць сарваны.

Неабходна, каб адпаведныя органы сказалі сваё слова адносна бюрократычных, ведамственых адносін будаўнічых організацый да падрыхтоўкі кадраў.

Дырэктар тэхнікуму С. Нісьневіч.

Нас ня рыхтуюць будаўнікамі

Неабходна прыняць усе захады для аздараўленьня школы Будвучу Белдзяржбуду.

(Адкрыты ліст)

Мы, вучні вадаправодна-ацяпленчага цэху школы ФЗВ „Будвуч» пры Мендзяржбудаб'яднаньні, з 18-га сьнежня 1930 году ня маем працы.

На неаднакротныя заявы ўсіх вучняў цэху, адміністрацыя школы і Мендзяржбудаб'яднаньне толькі абяцалі дапамагчы.

У Менску зараз ёсьць толькі два об'екты працы: пабудова чыгуначнай больніцы і заводу „Комунар". Але на раёне шмат працы. Адміністрацыя-ж адмаўляецца пасылаць вучняў на раён.

Тэорэтычнае навучаньне ў школе пастаўлена вельмі дрэнна і нездавальняе запатрабаваньні вучняў. Настаўнікі не адпавядаюць запатрабаваньням часу.

Мы патрабуем, каб у найкарацейшы тэрмін нам вызначылі об'ект працы, бо за 8-м месяцаў навучаньня ў будвучы, мы чатыры месяцы не працуем. Увесь цэх згодзен выехаць на раён.

Вучні „Будвучу": Левін, Патэнт, Нахумаў, Ананька, Цыпін, Мацкевіч, Богін, Сіндэр, Столяр, Сапір, Закіс, Харык, Быліна, Пілінушка.

Пляны рашаючага выканаем!

БАБРУЙСК (Ад нашага юнкора)—Гэтымі днямі адбылася першая гарадзкая конфэрэнцыя робочай моладзі саюзу будаўнікоў, на якой прысутнічала 300 чалавек. Конфэрэнцыя заслухала даклад начальніка будаўніцтва аб кантрольных лічбах будаўнічага сэзону бягучага рашаючага году пяцігодкі і задачах моладзі.

Выступаўшыя ў спрэчках маладыя будаўнікі адзначалі, што неабходна рацыянальна скарыстаць будаўнічы матар'ял, змагацца за якасьць будаўніцтва, разгарнуць соцспаборніцтва і ўдарніцтва, культмасавую выхаваўчую працу сярод будаўнікоў, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на сэзоньнікаў, якія прыбываюць на будаўніцтва.

Маладыя будаўнікі, дэлегаты конфэрэнцыі, цалкам абвясьцілі сябе ўдарнікамі і абавязаліся з посьпехам выконваць тую працу, якая будзе на іх ускладзена пры выкананьню плянаў 3-га рашаючага году пяцігодкі. Хазанаў

Да далейшых перамог на фронце будоўлі сацыялізму

Прывітаньне старш. СНК БССР М. ГАЛАДЗЕДА колектыву працаўнікоў 1 БДТ

Гарачае прывітаньне ўсяму калектыву, адміністрацыі і ўсім працаўнікам першага дзяржаўнага Беларускага тэатру.

Вітаю вас таварышы з дзесяцігадовым юбілеем тэатру, заклікаю вас да далейшых перамог на фронце будоўлі сацыялізму.

М. ГАЛАДЗЕД.

Опэрацыйная зводка

У барацьбе за бальшавіцкі фінплян выраўнаць фронт

Пухавіцкая і Лёзьненская організацыі па-за шэрагамі барацьбітоў

У выкананьні соцумовы з Украінай, комсамольская організацыя Беларусі ідзе няроўным фронтам.

Сёньня гаворыць Пухавіцкая, Расонская і Лёзьненская організацыі

Юхавіцкая ячэйка Расонскага раёну перавыканала кантрольныя лічбы па мобілізацыі сродкаў на 200 проц. Высунула сустрэчны плян і выклікае ўсю організацыю раёну на перавыкананьне кантрольных лічбаў. Посьпех гэтае ячэйкі—вынік таго, што яна зразумела ўсю важнасьць мобілізацыі сродкаў і вышла на фронт выкананьня фінпляну ў поўнай баявой гатоўнасьці.

Зусім іншае становішча ў Пухавіцкай і Лёзьненскай організацыях. Комсамольская організацыя Пухавіцкага раёну абыходзіць мобілізацыю сродкаў, хаваючыся за лічбы выкананьня пляну па раёне. Аднак самы факт выкананьня пляну пры бязьдзейнасьці раённай комсамольскай організацыі сьведчыць аб тым, што Пухавіцкі раён, узмацніўшы ўдзел комсамолу ў гэтай рабоце, здолее выйсьці ў рады першых.

У Лёзьненскім раёнё справа горш.

Комсамольскія організацыі павінны змагацца за перавыкананьне пляну мобілізацыі сродкаў. Бязьдзейнасьць у гэтай галіне ёсьць праява опортунізму на практыцы.

„Чырвоная Зьмена“ распачала праверку выкананьня соцумовы з Украінай.

Чарговымі выходзяць: Дубровенская, Чачэрынская і Багушэўская організацыі.

Комсамольцы і юнкоры гэтых раёнаў, уключайцеся ў праверку!

Юнкорыя, раскажы як твая ячэйка, колектыў выконваюць соцумову з Украінай.

Юхавіцкія комсамольцы выканалі плян на 200 пр.

РАСОНЫ. Вызначанае Расонскім Райкомам комсамолу кантрольнае заданьне—мобілізаваць сродкі насельніцтва ў суме 400 руб. на I-шы квартал бягучага году і завербаваць 40 укладчыкаў у ашчадкасы—Юхавіцкая ячэйка комсамолу перавыканала.

На першы квартал ячэйка завербавала 98 укладчыкаў і па мобілізацыі сродкаў дала 800 рублёў.

Ячэйка высунула сустрэчны плян рэалізацыі білетаў лётарэі Асовіяхэму.

Юхавіцкая ячэйка выклікае ўсе ячэйкі Расонскага раёну перавыканаць па раёне кантрольныя лічбы мобілізацыі сродкаў у 32 тысячы рублёў і завербаваць 3000 укладчыкаў у ашчадкасы.

Разгорнутым соцспаборніцтвам перавыканаем гэтыя лічбы.

Алесь Шырокі.

Дабіцца перавыкананьня

ПУХАВІЧЫ. — Кантрольная лічба, вызначаная для раёну кіраўніцтвам ашчадкасамі, выканана на 263 проц. Сустрэчны плян мобілізацыі сродкаў РВК выкананы на 93 проц.

Але побач з гэтым, комсамольская організацыя раёну зусім слаба працуе па выкананьню пастановы ЛКСМБ і абавязваў, прынятых соцумоваю з Украінай. Паасобныя ячэйкі яшчэ нават ня вылучылі організатараў працы па мобілізацыі сродкаў.

На конфэрэнцыю працаўнікоў ашчадкас, старшынь селькамсодаў і організатараў ашчадсправы комсамольскіх ячэек, склікаеную райашчадкасай, зьявілася зусім нязначная колькасьць комсамольскіх організатараў.

Райком комсамолу павінен дабіцца зруху ва ўдзеле комсамольцаў, у выкананьні і перавыкананьні сустрэчнага пляну мобілізацыі сродкаў на раёне.

Лявонка.

У комсамольцаў Лёзны прарыў

ЛЁЗНА. Плян мобілізацыі сродкаў па Лёзьненскім раёне праваленым. Комсамольскія ячэйкі нічога не рабілі для таго, каб выканаць плян.

Складзеная з Сіроцінскай раённай організацыяй соцумова па мобілізацыі сродкаў ня выконваецца. Зусім нездавальняюча ўцягваюцца новыя ўкладчыкі. Нават ня ўсе комсамольцы зьяўляюцца ўкладчыкамі ашчадкасы, ня гледзячы на тое, што Райком комсамолу выносіў рад пастаноў аб узьмацненьні гэтае працы.

Заданьне па рэалізацыі пазыкі „5-годка—у 4 гады“ ня выканана.

На нарадзе актыву, скліканай Райкомам комсамолу па пытаньню аб удзеле організацыі ў мобілізацыі сродкаў і ліквідацыі прарываў па раёне, комсамольцы - актывістыя (Сьвердлін, Каган, Фінкельштэйн) адмовіліся выехаць на вёску для ўдзелу ў рэалізацыі пазыкі „5-цігодка—у чатыры гады“. Яны пачалі даводзіць, што гэта не магчыма, што гэтым нічога нельга дасягнуць у рэалізацыі пазыкі.

Баявая задача організацыі—ліквідаваць ганебны прарыў.

К. Кароль.

60 ТЫСЯЧ--НЯ МЕНШ

Мацаваць джала бальшавіцкай самакрытыкі--юбіляра „Чырвонку“

Абвешчан чырвоназьменаўскі набор у комсамол

7-га красавіка ў Мазыры адбылася раённая конфэрэнцыя чытачоў і юнкораў „Ч. З.“

Конфэрэнцыя адзначыла, што „Чырвоная Зьмена“ справілася з ускладзенымі на яе задачамі ў 3-ці, рашаючы год пяцігодкі. Адзначыліся і недахопы ў працы „Чырвонкі“, як напрыклад, зусім невыстарчальная праца з юнкорамі вясковых раёнаў, несвоечасовыя адказы ў некаторых выпадках на дописы юнкораў.

Конфэрэнцыя ў адзнаку 10-ці гадовага юбілею „Ч. З.“ абвясьціла па раёне „Чырвоназьменаўскі“ набор у комсамол.

У сваіх пастановах конфэрэнцыя адзначыла, што заданьне, па выпісцы „Ч. З.“ ня выконваецца. Замест 2000 экз., выпісваецца ўсяго 750. Дэлегаты абавязаліся правесьці ў жыцьцё кантрольную лічбу—2000 экз.

Дэлегаты, у адзнаку 10-ці гадовага юбілею, аб'явілі сябе ўдарнікамі на 100 проц. выкананьне ўсіх відаў загатовак і мобілізаванымі на пасьпяховае правядзеньне пасеўкампаніі і разгортваньне колгаснага руху па раёне.

Мазалеўская.

У адзнаку юбілею—брыгады па пасаўкампаніі і колектывізацыі

У вёсцы Новыя Дамановічы комсамольская ячэйка складаецца з 10 комсамольцаў. Апроч комсамольцаў на вёсцы каля 40 чалавек беспартыйнай моладзі.

Да гэтага часу выпісваліся толькі 5 экзэмпляраў „Ч. З.“.

Упаўнаважанага па выпісцы „Ч. З.“ ячэйка ня вылучыла, ня гледзячы на тое, што Мазырскі раён быў ужо занесены на чорную дашку за невыкананьне заданьня па выпісцы.

На агульным адчыненым комсамольскім сходзе, дзе абгаварвалася пытаньне аб падрыхтоўцы да юбілею, пастаноўлена: замест 5 экз.—выпісваць ня менш 50 экз. Організавана брыгада імя 10-ці гадовага юбілею па правядзеньню пасеўкампаніі і колектывізацыі, а таксама—гурток па вывучэньню пастаноў VI-га зьезду саветаў. Зараз ужо разгорнута праца па падрыхтоўцы беспартыйнай моладзі для ўступленьня ў комсамол. Організаваны юнкораўскі пост. Намечана 25-га красавіка правесьці вечар, прысьвечаны юбілею „Ч. З.“. На гэтым-жа сходзе абраны дэлегаты на раённыя конфэрэнцыі чытачоў і юнкораў.

М.

Заданьне выканалі на 290 проц. і выклікаем на спаборніцтва Вышацкую яч. ЛКСМБ

Зайкоўская комсамольская ячэйка па-ўдарнаму ўзялася за вярбоўку падпішчыкаў на „Ч. З.“. Усе комсамольцы Зайкоўскай ячэйкі выпісваць „Ч. З.“

Заданьне РК ЛКСМБ выканана на 290 проц. Падпіскай на „Ч. З.“ ахоплена шмат беспартыйнай моладзі.

Зайкоўская ячэйка выклікае на спаборніцтва Вышацкую ячэйку ЛКСМБ і абавязваецца дасягнутыя посьпехі замацаваць надалей.—

Пракопаў.

У адзнаку юбілею ідуць у комсамол

У коопэрацыйнай школе БКС у Бабруйску комсамольская ячэйка налічвае 18 чал. Але зараз, у адзнаку 10-ці гадовага юбілею „Ч. З.“ ячэйка прыняла ў свае рады яшчэ 6 чалавек.

Адна з ударных брыгад колектыўна падала заяву ў комсамол. Організаваны яшчэ 2 ударныя брыгады імя „Чырвонай Зьмены“. Дваццаць вучняў аб'явілі сябе ўдарнікамі.

Чарняўскі П.

Слаба асьвятляецца антырэлігійнае пытаньне

„Чырвоная Зьмена“ ўвесь час, што я яе чытаю, давала і дае мне напрамак у маёй штодзеннай працы. Але ўсё-ж такі трэба адзначыць яе хібы. Прыкладам, мала ўдзяляецца ўвагі антырэлігійнаму выхаваньню моладзі.

Неабходна ў далейшым больш заняцца гэтым пытаньнем, а таксама адвесьці на старонках газэты вайсковы куток, у якім-бы асьвятляць працу лепшых і горшых ячэек Асоавіяхэму.

Грыб.

Рашуча змагацца з усялякімі недахопамі

Мы, ударнікі-комсамольцы Магілеўскай швэйнай фабрыкі імя Валадарскага, Гарэлаў, Лапухіна і Халопаў організаваліся ва ўдарную брыгаду юнкораў імя X юбілею „Ч. З.“ і абавязваемся: удзельнічаць і дапамагаць фабрычнай насьценгазэце-шматтыражцы весьці барацьбу за выкананьве прамфінпляну і рашуча змагацца з усялякімі недахопамі на вытворчасьці, што перашкаджаюць ажыцьцявіць 5-ці годку ў 4 гады. Абавязваемся стаяць у першых радох лепшых ударнікаў і паказаць прыклады, як трэба змагацца за выкананьне прамфінпляну. Узьнімем тыраж «Ч.З.“ на нашай фабрыцы на належную вышыню.

Брыгада юнкораў: Гарэлаў, Лапухіна З. і Халопаў.

Раз у 5-цідзёнку аб вайсковай працы

Барацьба моладзі на гаспадарчым фронце знаходзіла свой яскравы адбітак на старонках „Ч. З.“. Побач з дадатнымі, у „Ч. З.“ ёсьць і адмоўныя бакі. Мала ўвагі ўдзяляла газэта вайсковай справе. Рэдка калі ўбачыш на яе старонках як праходзіць ваенізацыя комсамолу на фабрыках і заводах, асабліва як пастаўлена ваенізацыя ў вайсковых ячэйках. А трэба азначыць, што ў вясковым комсамоле ваенізацыя знаходзіцца ў дрэнным стане. На старонках „Ч. З.“ таксама не адбіта, як выконваюцца пастановы IX і X-га зьездаў комсамолу па ваенізацыі.

„Чырвоная Зьмена“ павінна стаць асноўным сродкам сувязі комсамолу Чырвонай арміі з комсамалам грамадзянскіх організацый. Уступаючы ў 11 год свайго існаваньня, „Чырвоная Зьмена“ павінна большую ўвагу ўдзяляць вайсковай справе, даючы раз у 5-ці дзёнку вайсковую падборку.

Я. Алешко

На 170 асоб—12 экзэмпляраў „Ч. З.“

На 170 вучняў другога концэнтру Гарбачэўская ШКМ выпісвае ўсяго 12 экз. „Ч. З“. Комсамольская ячэйка ня прымае ніякіх захадаў для распаўсюджваньня „Ч. З“ Аб кантрольнай лічбе па выпісцы „Ч. З.“ ніхто ня ведае.

Да 10-ці гадовага юбілею „Ч. З.“ комсамольская ячэйка павінна зараз-жа абвясьціць паход за 60-тысячны тыраж „Ч. З“.

У. Новік, П. Літвінко.

Будзем драцца за 60 тысяч

Мазырская раённая комсамольская конфэрэнцыя чытачоў і юнкораў „Чырвонай Зьмены“, у дзень не 10-ці гадовага юбілею, шле шчырае комсамольскае прывітаньне.

Конфэрэнцыя запэўнівае цэнтральны орган ЦК ЛКСМБ—„Чырвоную Зьмену“, што пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі будзе драцца за справу соцбудаўніцтва, за 60-тысячны тыраж „Чырвонай Зьмены“, за разгортваньне бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі, пашыраючы па раёне юнкоррух, даючы рашучы адпор клясаваму ворагу і яго агентуры праваопортуністым, якія перашкаджаюць нашаму соцбудаўніцтву.

Па даручэньню прэзыдыуму конфэрэнцыі—Мазалеўская.

Да юбілею „Ч. З.“ штурмуем прарывы

Агульны адчынены комсамольскі сход фабрыкі „Комунарка“ ўзяў на сабе абавязак да юбілею „Ч. З.“ выканаць пастанову 10-га зьезду комсамолу Беларусі: Ніводнага комсамольца бяз „Ч. З.“. Сход таксама даручыў разгарнуць падпіску на „Чырвоную Зьмену“ сярод беспартыйнай моладзі і організаваць юнкораўскую брыгаду „Ч. З.“

Да юбілею „Ч. З.“ комсамольцы фабрыкі абвясьцілі месячнік штурму для ліквідацыі прарываў у выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну.

Брыгада „Ч. З.“

Ліквідуйце недахоп

Капыльскі РК ЛКСМБ не вядзе ніякай працы па распаўсюджваньню юнацкага друку, у прыватнасьці „Ч. З.“

Пры РК ЛКСМБ няма нават упаўнаважанага „Ч.З.“. Ужо адно гэта гаворыць аб тым, як Капыльскі райкамол зацікаўлены ў правядзеньні ў жыцьцё пастановы ЦК ЛКСМБ і 10-га зьезду Комсамолу Беларусі аб тым, што кожны комсамолец павінен чытаць „Чырвоную Зьмену».

Колгасьнік

Паведамленьні

Прапануецца ўсім вылучаным брыгадам па падрыхтоўцы матар'ялаў к пленуму Гаркому, да 18-4-1931 г. здаць матар'ялы ў Орг-інструктарскі аддзел Гаркому.

Т. т., якія не здадуць матар'ялы, будуць перададзены ў Гар. КК ЛКСМБ. Загадчык Оргаддз.

К. Рудніцкі

Сёньня, роўна а 7 гадз. увеч., у залі пасяджэньняў Менскага гаркому КП(б)Б адбудзецца закрыты сход сэкратароў колетываў Менскай організацыі ЛКСМБ.

Яўка абавязкова.

Сэкратар Гаркому ЛКСМБ. **Янковіч**

Друкарня імя тав. Сталіна

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Галоўлітбел № 599